БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 811.161.3'286(476.7)(043.3)

**САМУЙЛІК
ЯРАСЛАЎ РЫГОРАВІЧ**

# ЛІНГВАГЕАГРАФІЯ ГАВОРАК ВЫГАНАЎСКАГА ПАЛЕССЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Мінск, 2015

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

| | |
|---|---|
| **Навуковы кіраўнік:** | **Клімчук Фёдар Данілавіч,**<br>кандыдат філалагічных навук,<br>лаўрэат Дзяржаўнай прэміі<br>Рэспублікі Беларусь |
| **Афіцыйныя апаненты:** | **Даніловіч Мікалай Аляксандравіч,**<br>доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускага і супастаўляльнага мовазнаўства УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» |
| | **Антропаў Мікалай Паўлавіч,**<br>кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык аддзела славістыкі і тэорыі мовы ДНУ «Цэнтр навуковых даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» |
| **Апаніруючая арганізацыя:** | УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» |

Абарона адбудзецца 25 верасня 2015 г. у 14 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.11 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, аўд. 62;
тэлефон вучонага сакратара: 209 55 58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы “22” чэрвеня 2015 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый С. М. Запрудскі

# УВОДЗІНЫ

Шматлікія пытанні даследавання зон, дзе адбываліся ўзаемаўплывы лінгвістычных (дыялектных) і этнаграфічных адметнасцей этнасаў, якія іх насялялі, застаюцца надзвычай актуальнымі і ў наш час. У гэтым плане тэрыторыя Выганаўскага Палесся ўяўляе сабой адзін з самых цікавых, асаблівых рэгіёнаў Беларусі. Тут праходзіць мяжа паміж заходнепалескай і гродзенска-баранавіцкай групамі гаворак. Акрамя таго, многія даследчыкі праводзяць паміж арэаламі названых гаворак старажытную балта-славянскую этнічную мяжу, якая, верагодна, праходзіла паміж рэкамі Ясельдай і Шчарай.

Выганаўскае Палессе – тэрыторыя ў міжрэччы Ясельды (прытока Прыпяці) і Шчары (прытока Нёмана), таксама ўключае невялікую частку басейна Шчары ў верхнім цячэнні. У яго межах знаходзіцца некалькі азёр, менавіта Выганашчанскае (26 км$^2$), Бабровіцкае (9,47 км$^2$), Гошча (0,82 км$^2$) і інш. У гэтым рэгіёне праходзіць Агінскі канал, пабудаваны ў 1767–1783 гг., які злучае Ясельду са Шчарай. Адміністрацыйна гэта паўднёвая частка Івацэвіцкага раёна (Целяханшчына) і сумежныя тэрыторыі Ганцавіцкага і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці. Геаграфічна і гістарычна дадзены рэгіён займае своеасаблівае прамежкавае становішча паміж "тыповым" Заходнім Палессем і Панямоннем, а ў этнаграфічным аспекце з'яўляецца месцам сутыкнення чатырох буйных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: Паўночна-Заходняга, або Панямоння, Цэнтральнай Беларусі, Усходняга Палесся і Заходняга Палесся. У лінгвістычным плане Выганаўскае Палессе – пераходная зона паміж гаворкамі Панямоння і Заходняга Палесся. Таму для больш дакладнага вызначэння структуры мясцовых гаворак і характару моўных працэсаў было вырашана даследаваць вышэйзгаданы рэгіён лінгвагеаграфічным метадам; пры гэтым аб'ектам вывучэння сталі гаворкі ўсіх населеных пунктаў. Комплекснае лінгвагеаграфічнае даследаванне і апісанне дыялектнай мовы дадзенага рэгіёна раней ніколі не праводзіліся, гэтым найперш і тлумачыцца навуковая навізна працы.

Актуальнасць лінгвагеаграфічнага даследавання гаворак Выганаўскага Палесся заключаецца ў тым, што карты лінгвістычнага атласа з'яўляюцца найбольш дакладнымі і выразнымі адбіткамі ўзаемадачыненняў розных моўных з'яў паміж сабою па структуры, межах пашырэння, іх генезісе, фарміраванні і развіцці ў часе і прасторы; яны даюць магчымасць вызначыць генетычныя і гістарычныя суадносіны беларускіх гаворак з гаворкамі іншых славянскіх моў па шырокім спектры фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей. Акрамя таго, карты "Атласа гаворак Выганаўскага Палесся" і лінгвістычнага атласа 'Гаворкі Выганаўскага Палесся" дапаўняюць, канкрэтызуюць і дэталізуюць даныя "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы" (1963) і

"Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак" (1993–1998), а таксама такіх спецыялізаваных дыялекталагічных выданняў, як "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак" (1968), "Лексічныя ландшафты Беларусі: жывёльны свет" (1995) і інш.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыя выканана на кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна ў межах навукова-даследчых тэм "Этналінгвістычны і лінгвакультуралагічны змест моўных адзінак Брэсцка-Пінскага Палесся (БПП)" (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20021100; тэрмін выканання 2002–2006 гг.) і "Мова Брэсцка-Пінскага Палесся (БПП) на гістарычна-часавым зрэзе другой паловы XX – пачатку XXI ст." (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20062321; тэрмін выканання 2006–2010 гг.).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта – на аснове палявых лінгвагеаграфічных і дыялекталагічных даследаванняў устанавіць структуру дыялектнага ландшафту Выганаўскага Палесся як састаўной часткі беларускіх народных гаворак. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

- у адпаведнасці з аўтарскай праграмай выявіць найбольш тыповыя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя адметнасці гаворак Выганаўскага Палесся, іх спецыфічныя рысы і міждыялектныя сувязі ў адносінах да беларускай дыялектнай мовы і славянскай моўнай прасторы;
- на аснове праведзеных пучкоў ізаглос вызначыць тэрытарыяльна-структурныя тыпы (разнавіднасці) дыялектных адзінак Выганаўскага Палесся (групы, падгрупы, мікрападгрупы, мікразоны) і іх месца ў сістэме беларускіх народных гаворак;
- выявіць у межах Выганаўскага Палесся характар пераходнасці паміж гродзенска-баранавіцкімі і берасцейска-пінскімі гаворкамі;
- вызначыць інавацыйныя цэнтры асобных фанетычных з'яў; на аснове асаблівасцей канфігурацыі ізаглос, якія акрэсліваюць арэалы гэтых з'яў, устанавіць іх адносную храналогію.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляюцца гаворкі Выганаўскага Палесся як вынік працяглых актыўных міждыялектных кантактаў і ўзаемаўплываў, адасобленасці пераважна прыроднымі межамі (у першую чаргу лясвымі і балотнымі масівамі) асобных густа заселеных мікрарэгіёнаў, міграцыйных і мікраміграцыйных працэсаў, перыферыі пэўных інавацыйных з'яў. **Прадмет**

даследавання – фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці і групоўка гэтых гаворак.

**Навуковая навізна**

На аснове сабранага фактычнага матэрыялу ўпершыню ў беларускай лінгвістыцы праведзена комплекснае лінгвагеаграфічнае і дыялекталагічнае даследаванне дыялектнай мовы Выганаўскага Палесся, якое знаходзіцца ў зоне міждыялектных кантактаў і ўзаемаўплываў гаворак Берасцейска-Пінскага Палесся і Панямоння.

Гэта дазволіла вызначыць характэрныя адметнасці гаворак рэгіёна на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі, пацвердзіць правамернасць вылучаных раней дыялектных адзінак, удакладніць іх межы, дапоўніць і сістэматызаваць моўныя асаблівасці, выдзеліць мікрападгрупы гаворак і дыялектную мікразону, выказаць меркаванні аб адноснай храналогіі асобных інавацыйных з'яў і паходжанні некаторых гаворак.

Складзены і выдадзены лінгвістычныя атласы: "Гаворкі Выганаўскага Палесся" (2009) і "Атлас гаворак Выганаўскага Палесся" (2013).

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Дыялектны ландшафт Выганаўскага Палесся ўяўляе сабою складаную і стройную сістэму: гаворкі рэгіёна маюць шэраг агульных моўных асаблівасцей, якія аб'ядноўваюць іх паміж сабою (напрыклад, этымалагічны ***о** ў канцавых адкрытых складах; прыстаўны [*г*] у слове *ара́ць*; галосны [*а*] на месцы ***ę** ў пераднаціскным складзе ў слове *ўзяла́;* націскны і ненаціскны канчатак *-ая* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне і інш.). Разам з гэтым тут выяўлены і значныя адметныя адрозненні на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі (напрыклад, галосныя [*о*], [*ô*], [*у͡о*], [*э͡(ê)*], [*ы*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам; цвёрдыя, паўмяккія і мяккія пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і**; канчаткі *-ем (-эм), -ом* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне і інш.).

2. Вылучаныя пучкі ізаглос на тэрыторыі Выганаўскага Палесся ўтвараюць чатыры асноўныя групы (серыі): *паўночную, паўднёвую, цэнтральную* і *лакальныя* пучкі ізаглос. Кожная група характарызуецца цэлым комплексам фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей. *Паўночная* група адлюстроўвае моўныя адметнасці, уласцівыя для гродзенска-баранавіцкіх гаворак або гродзенска-баранавіцкіх і пэўнай часткі іншых дыялектных адзінак; *паўднёвая* група – асаблівасці, характэрныя для берасцейска-пінскіх гаворак або берасцейска-пінскіх і пэўнай часткі іншых гаворак; *цэнтральная* група – адметнасці, уласцівыя пераважна для цэнтральнай часткі гаворак, яны супрацьпастаўляюцца як гродзенска-баранавіцкім, так і берасцейска-пінскім гаворкам; *лакальныя* пучкі ізаглос – асаблівасці, характэрныя для невялікіх

мікраарэалаў, што лакалізуюцца ў розных частках (пераважна ўсходняй і заходняй) рэгіёна і ўтвараюць мікрападгрупы: 1) усходнецеляханскую; 2) заходнецеляханскую. На аснове пучкоў ізаглос і іх фрагментаў вызначаны дакладныя межы паміж групамі (падгрупамі) гаворак.

3. На тэрыторыі Выганаўскага Палесся зафіксавана пашырэнне значнай сукупнасці моўных з'яў фанетычнага, марфалагічнага і лексічнага характару; на іх аснове праведзены дакладныя межы паміж асобнымі групамі (падгрупамі) гаворак, дапоўнены і сістэматызаваны іх асаблівасці. Характар пераходнасці паміж гродзенска-баранавіцкай і заходнепалескай (берасцейска-пінскай) групамі гаворак у межах рэгіёна "ступеньчаты": нарастанне адрозненняў назіраецца ад адной групы (ці падгрупы) да другой. У выніку даследавання на тэрыторыі Выганаўскага Палесся ўпершыню акрэслены межы цэнтральнацеляханскай падгрупы паўночнабрэсцкіх гаворак, унутры яе выдзелены ўсходне- і заходнецеляханская мікрападгрупы, вызначаны моўныя адметнасці гаворкі мястэчка Целяханы.

4. У межах Выганаўскага Палесся ўпершыню вылучана целяханская дыялектная мікразона, якая ўключае цэнтральнацеляханскую падгрупу і паўднёвацеляханскую групу гаворак. Гэтай мікразоне характэрны шэраг спецыфічных асаблівасцей у галіне фанетыкі, марфалогіі і лексікі (напрыклад, рэфлекс ***о** > [*э̂(ê)*] ў новых закрытых складах пад націскам; пераважна губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы; формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксамі *-ці, -ті* і інш.).

5. Выганаўскае Палессе з'яўляецца ўскраінай пашырэння інавацыйных з'яў, якія пранікалі ў гэты рэгіён з двух цэнтраў – паўночнага, ці гродзенска-баранавіцкага, і паўднёвага, ці берасцейска-пінскага. Трэці цэнтр – сярэднябрэсцкія інавацыі – узнік у гэтым рэгіёне (састаўной часткі сярэдняй паласы Берасцейшчыны). Для паўночнага цэнтра характэрны наступныя з'явы: 1) пераважна ацвярдзенне мяккіх шыпячых і ***р'**; 2) пераважна ацвярдзенне мяккага ***ц'** і інш. Для паўднёвага цэнтра ўласцівы: 1) ацвярдзенне этымалагічных паўмяккіх губных перад ***е**; 2) ацвярдзенне гістарычных паўмяккіх зычных ***д, *т, *з, *с, *н** перад ***е** і інш. Для сярэднябрэсцкіх інавацый характэрны: 1) пераход галоснага ***о** ў новых закрытых складах пад націскам у [э̂] "закрытае" або [э], утварэнне форм тыпу "*хóдзіт, хóдзят /хóдз$^{д}$іт, хóдз$^{д}$ят, хóдіт, хóдят/*" у цэнтральнацеляханскіх і паўднёвацеляханскіх гаворках; 2) пераход мяккіх і паўмяккіх ***д' /*д˙, *т'/ *т˙** пераважна ў палаталізаваныя [*дз'*], [*ц'*] у паўночнабрэсцкіх гаворках даследаванага арэала. Інавацыйныя з'явы выцеснілі ранейшыя моўныя рысы (ці архаізмы). Аднак у гаворках рэгіёна некаторыя архаічныя з'явы захаваліся (галосны ***о** ў пераднаціскных складах – ва ўсіх гаворках, акрамя гродзенска-баранавіцкіх; паўмяккія ***д˙, *т˙** перад ***е, *і** – у некаторых валішчанска-

аброўскіх гаворках; пазіцыйна абмежаваны мяккі *ц' – у асобных сярэднезагародскіх і валішчанска-аброўскіх гаворках і інш.).

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыя з'яўляецца цалкам самастойнай працай, выкананай на аснове праведзенага палявога абследавання ўсіх населеных пунктаў на тэрыторыі Выганаўскага Палесся па спецыяльна распрацаванай аўтарскай праграме, сабранага і апрацаванага дыялектнага матэрыялу.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання ў выглядзе дакладаў і паведамленняў прайшлі апрабацыю на наступных міжнародных і рэгіянальных канферэнцыях і семінарах: Рэспубліканская канферэнцыя "Науково-технічна революція і сучасні процеси розвитку лексики українськоі народно-розмовноі мови" (Ужгарад, 14–16 лістапада 1989 г.), рэгіянальная навуковая канферэнцыя да 80-х угодкаў прафесара Ф. Янкоўскага "Жыццём слугуючы Айчыне" (Брэст, 19 лістапада 1998 г.), VI Міжнародная навуковая канферэнцыя "Словообразование и номинативная деривация в славянских языках" (Гродна, 28–29 мая 1999 г.), Міжнародна конференція на честь 80-річчя професора Йосіпа Дзендзелівського (Ужгарад, 17–19 лютага 2001 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Теоретичні та методологічні засади сучасноі діалектологіі" (Жытомір, 4–6 кастрычніка, 2002 г.), Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Берасцейска-Пінскае Палессе: мова, літаратура, гісторыя", прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка (Брэст, 24–25 кастрычніка 2002 г.), Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя "Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования" (Брэст, 12–13 лістапада, 2003 г.), IV Міжнародная навуковая канферэнцыя "Мовы ў Вялікім княстве Літоўскім і краінах сучаснай Цэнтральнай і Усходняй Еўропы: традыцыі і пераемнасць" (Брэст, 18–19 мая 2004 г.), навуковы семінар "Актуальні проблеми украïнськоï діалектологіï. Засідання 9. Лінгвістичний атлас: проблеми створення й інтерпретаціі" (Львоў, 20–21 мая 2005 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Имя и слово (проблемы семантико-прагматического взаимодействия в славянских языках)" (Брэст, 19–20 красавіка 2007 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Західнополіські говірки в просторі та часі" (Луцк, 22–23 красавіка, 2010 г.), Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Берасцейшчына: моўна-культурная прастора" (Брэст, 21 сакавіка, 2013 г.).

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі таксама выкарыстаны пры чытанні лекцый, правядзенні практычных, лабараторных заняткаў і дыялекталагічнай практыкі па курсе "Беларуская дыялекталогія" на філалагічным факультэце, пры правядзенні практычных заняткаў па курсе "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" на матэматычным, фізічным,

геаграфічным і юрыдычным факультэтах Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, а таксама на факультэце электронна-інфармацыйных сістэм, машынабудаўнічым, эканамічным, будаўнічым факультэтах, факультэце інжынерных сістэм і экалогіі і факультэце інавацыйнай дзейнасці, кіравання і фінансаў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 21 працы агульным аб'ёмам 45, 12 аўт. арк., з якіх 5 артыкулаў у перыядычных выданнях (3, 19 аўт. арк.), з іх – 4 у рэцэнзуемых (2, 27 аўт. арк.), у тым ліку ў замежных – 1 (0, 36 аўт. арк.), 1 – у нерэцэнзуемым (0, 92 аўт. арк.); 6 артыкулаў у навуковых зборніках (6, 14 аўт. арк.), з іх – 1 у суаўтарстве (0, 5 аўт. арк.), у тым ліку ў замежных – 4 (5, 14 аўт. арк.); 8 матэрыялаў і тэзісаў навуковых канферэнцый (1, 29 аўт. арк.), у тым ліку ў замежных – 1 (0, 1 аўт. арк.); 2 рэгіянальныя лінгвістычныя атласы (34, 4 аўт. арк.).

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне складаецца з пераліку ўмоўных абазначэнняў, уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (174 найменні), які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (153 найменні) і спіс публікацый саіскальніка (21 найменне), двух дадаткаў.

Агульны аб'ём даследавання – 461 старонка, асноўны тэкст займае 136 старонак (пры гэтым падаецца 2 рысункі – 2 старонкі, 2 табліцы – 2 старонкі), бібліяграфічны спіс – 16 старонак, дадаткі – 291 старонка.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Першая глава **"Гаворкі Выганаўскага Палесся як аб'ект лінгвістыкі"** складаецца з наступных раздзелаў: 1.1 ***"Гістарычны нарыс Выганаўскага Палесся"***; 1.2 ***"З гісторыі вывучэння гаворак Выганаўскага Палесся"***; 1.3 ***"Матэрыялы і праграма даследавання"***.

У першым раздзеле на аснове работ пераважна беларускіх і рускіх навукоўцаў адлюстраваны найбольш значныя факты гісторыі Выганаўскага Палесся, якія паўплывалі на развіццё (у прыватнасці, на фарміраванне дыялектнага ландшафту) гэтага рэгіёна.

У другім раздзеле разгледжаны і прааналізаваны работы па фальклоры, этнаграфіі, дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі беларускіх, рускіх, украінскіх і польскіх даследчыкаў па праблемах гаворак Берасцейска-Пінскага Палесся і сумежжа ўвогуле і Выганаўскага Палесся ў прыватнасці з сярэдзіны XIX да пачатку XXI ст.

У трэцім раздзеле падаюцца звесткі пра сабраны дыялектны матэрыял, сетку атласа, праграму даследавання, узрост інфарматараў, выдадзеныя аўтарам дысертацыі рэгіянальныя дыялекталагічныя атласы.

Лінгвагеаграфічнае даследаванне гаворак Выганаўскага Палесся праводзілася намі на працягу 1985–2009 гг. Фактычны матэрыял збіраўся пераважна ў паўднёвай частцы Івацэвіцкага і на сумежнай тэрыторыі Пінскага, Ганцавіцкага (асноўная сетка атласа), а таксама Бярозаўскага, Драгічынскага, Кобрынскага і Столінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Жыткавіцкага і Клецкага раёнаў адпаведна Гомельскай і Мінскай абласцей (дадатковая сетка атласа).

Усяго складзена 253 карты, у тым ліку ўступныя – 12 (агульныя – 4, гістарычныя – 8), лінгвістычныя – 142 (фанетычныя – 56, марфалагічныя – 33, лексічныя – 53), ізаглосныя – 99. Уступныя і лінгвістычныя карты разам з дадатковымі матэрыяламі першы раз апублікаваны ў атласе “Гаворкі Выганаўскага Палесся” (Брэст : БрДУ, 2009). Сетка атласа складаецца з дзвюх частак: асноўнай (26 населеных пунктаў) і дадатковай (8 населеных пунктаў). У лінгвістычным атласе “Гаворкі Выганаўскага Палесся” ўсяго 154 карты, з іх 12 уступныя (№ I–XII) і 142 лінгвістычныя. У 2013 г апублікаваны “Атлас гаворак Выганаўскага Палесся” (Брэст : БрДТУ). У параўнанні з папярэднім выданнем у яго ўнесены невялікія змены, а таксама дабаўлены раздзелы “З водзываў на атлас”, “З гісторыі Выганаўскага Палесся” (дадатковыя матэрыялы), “Тыпалогія ізаглос” (99 карт). Сабраны і закартаграфаваны матэрыял мае дастатковую колькасць супрацьстаўленых адрозненняў для вызначэння дыялектнай прыналежнасці гаворак Выганаўскага Палесся. Для дысертацыйнага даследавання ўзяты толькі тыя моўныя асаблівасці, што распаўсюджаны на тэрыторыі асноўнай сеткі “Атласа гаворак Выганаўскага Палесся” і лінгвістычнага атласа “Гаворкі Выганаўскага Палесся”.

Другая глава “**Дыялектныя адметнасці гаворак Выганаўскага Палесся**” прысвечана даследаванню фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей гаворак гэтага рэгіёна.

У раздзеле 2.1 “***Фанетыка***” разглядаецца гукавы лад гаворак Выганаўскага Палесся. Раздзел уключае два падраздзелы.

У першым падраздзеле вывучаецца сістэма галосных гукаў (вакалізм) гаворак рэгіёна. Вакалізм гаворак Выганаўскага Палесся характарызуецца рознай рэалізацыяй гістарычных галосных: на месцы ***о** ў пераднаціскных складах пасля цвёрдых зычных: /*даро́га, малако́ – доро́га, молоко́*/; на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам /*воз, стол, кон' – во̂з, сто̂л, ко̂н' – ву͡оз, сту͡ол, ку͡он' – вэ̂з, в'е̂з, стэ̂л, кэ̂н', к'е̂н' – выз, стыл, кын'*/; на месцы націскнага ***ѣ** /*л'ес, с'е́но – л'е̂с, с'е̂́но – л'і͡ес, с'і͡е́но – л'іс, с'і́но – л˙ы$^э$с, с˙ы$^э$но*[1]/; на месцы ***е**, ***ѣ** ў першым пераднаціскным складзе пасля губных

[1] [ы$^э$] – галосны гук сярэдні паміж [ы] і [э].

зычных */в’асна́, б’ада́, васна́, бада́ – вэсна́, бэда́, в’есна́, б’еда́ – вы$^{э}$сна́, бы$^{э}$да́/;* на месцы ***е** ў першым пераднаціскным складзе пасля пярэднеязычных [*дз*] < ***д, *з, *с**, [*ц*] < ***т, *н** */з’емл’а́, с’ело́, зэмл’а́, сэло́ – з˙ы$^{э}$мл’а́, с˙ы$^{э}$ло́/;* на месцы ***ę** ў перадналціскным складзе ў словах ***глядзе́ў, злякáўся, злякáцца*** */гл’адз’е́ў, зл’акáўс’а – гл’едз’е́в, зл’екáвса/;* на месцы ***ę** ў паслянаціскным складзе ў словах ***зáяц, пáмяць*** */зáйац, пáм’ац’ – зáйец, пáмэц’/;* на месцы ***ы** ў націскным і першым перадналціскным складзе пасля губных зычных */мыш, пыл, высо́ко – м’іш, п’іл, в’ісо́ко/;* націскны ***ы** ў словах тыпу ***сын, валы́, ры́ба, дым*** */сын, волы́, ры́ба – сы·н, волы́·, ры́·ба*[2] *– с˙ин, вол˙и́, р˙и́ба*[3]*)* і інш.

У <u>другім падраздзеле</u> даследуецца сістэма зычных гукаў (кансанантызм) гаворак рэгіёна. Кансанантызм гаворак Выганаўскага Палесся характарызуецца рознай рэалізацыяй этымалагічных зычных і іх спалучэнняў: губныя перад рэфлексамі ***е, *ѣ** */в’есна́, б’е́рог, б’еда́ – вэсна́, бэ́рог, бэда́*[4]*/;* губныя перад рэфлексамі ***і** */м’і́ска, роб’і́ц’і – м˙и́ска, роб˙и́т˙и – мы́ска, робы́ты/;* пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е** */з’емл’а́, по́л’е – з˙эмл’а́, по́л˙э – зэмл’а́, по́лэ/;* пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і** */з’іма́, л’і́па – з˙има́, л˙и́па – зыма́, лы́па/;* ***д, *т** перад рэфлексамі ***е, *і** */дз’’ен’, ц’’ап’е́р, хадз’’і́ц’’, ц’’і́хо*[5] *– дз’ен’, ц’епэ́р, ходз’і́ц’і, ц’і́хо*[6] *– дз$^{д}$’ен’, ц$^{т}$’епэ́р, ходз$^{д}$’і́ц$^{т}$’і, ц$^{т}$’і́хо*[7] *– д’ен’, т’епэ́р, ход’і́т’і, т’і́хо – д˙эн’о́к, т˙эпэ́р, ход˙и́т˙и, т˙и́хо – дэн’, тэпэ́р, ходы́ты, ты́хо/;* ***д, *т** перад рэфлексамі націскнога ***ѣ** */дз’’ед, ц’’ен’ – дз’ед, ц’ен’ – дз$^{д}$’ед, ц$^{т}$’ен’ – д’ед, т’ен’ – ды$^{э}$д, ты$^{э}$н’/;* ***т** на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку */хо́дз’’іц’’, хо́дз’’ац’’ – хо́дз’іц’, хо́дз’ац’ – хо́дз’іт, хо́дз’ат – хо́д’іт’, хо́д’ат’/;* заднеязычныя ў спалучэннях ***гы, *кы, *хы** */до́вг’і, коро́тк’і, ц’і́х’і – до́вг˙и, коро́тк˙и, т˙и́х˙и – до́вгы, коро́ткы, ты́хы/;* рэалізацыя губнога ***м** перад ***ę** */мн’áсо, помн’áв – мйáсо, помйáв/;* шыпячыя і зычны ***р** /толькі цвёрдыя шыпячыя і [*р*] – наяўнасць паўмяккіх шыпячых і [*р˙*] – наяўнасць мяккіх шыпячых і [*р’*]/; мяккі ***ц** /толькі цвёрды [*ц*] – наяўнасць паўмяккага [*ц˙*] – пазіцыйна абмежаваны мяккі [*ц’*]/; рэфлексы ***в** (< ***в, *л**) пасля галосных /паўгалосны [*ў*] *(прáўда, до́wг’і, куп’і́ў)* – губна-губны [*w*] *(прáwда, до́wг’і, куп’і́w)* – губна-зубны [*v*] *(прávда, до́vг˙и, куп˙и́v)/;* звонкія зычныя на канцы слова */вə̂з, дуб – вə̂з$^{с}$, дуб$^{п}$*[8] *– вос, дуп/;* звонкія зычныя перад глухімі ў сярэдзіне слова */кáзка, загáдка – кáз$^{с}$ка, загáд$^{т}$ка – кáска, загáтка/;* зычныя на месцы спалучэнняў ***-лј-, *-нј-** паміж галоснымі */з’е́л’л’е, нас’е́н’н’е – з’е́л’йе, нас’е́н’йе/;* пратэтычныя зычныя /адпадзенне пачатковага гука/ у словах *ву́ліца, во́чы, во́сень, во́стры, ніво́днага, ану́ча /ву́л’іца – у́л’іца;*

---

[2] [*ы·*] – галосны верхняга пад’ёму пярэдняга (пярэдне-сярэдняга) рада.
[3] [*и*] – галосны верхняга пад’ёму сярэдняга рада (сярэдні паміж [*і*] і [*ы*]).
[4] Перад рэфлексам *е губныя цвёрдыя ва ўсіх пазіцыях, перад рэфлексам *ѣ – у ненаціскных складах.
[5] [*дз’’*], [*ц’’*] – зычныя мяккія палатальныя.
[6] [*дз’*], [*ц’*] – зычныя мяккія палаталізаваныя.
[7] [*дз$^{д}$’*] – вымаўленне [*дз*] з прыгукам [*д*], [*ц$^{т}$’*] – вымаўленне [*ц*] з прыгукам [*т*].
[8] Частковае аглушэнне звонкіх зычных.

*во́чы – го́чы – о́чы; во́с'ен' – о́с'ень; го́стры – о́стры; н'іго́дного – н'іо́дного; гану́ча – ону́ча – ну́ча/* і інш.

Раздзел 2.2 *"Марфалогія"* прысвечаны вызначэнню асаблівасцей асноўных зменных часцін мовы: назоўніка, прыметніка, займенніка, дзеяслова. Раздзел складаецца з чатырох адпаведных падраздзелаў.

У <u>першым падраздзеле</u> разглядаюцца наступныя канчаткі назоўнікаў: мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне */кон'е́м, йейцэ́м – кон'о́м, йайцо́м/;* жаночага і мужчынскага роду адзіночнага ліку першага і другога скланенняў з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне */на мэжэ́ – на мэжэ̂ – на м'ажы́; на дворэ́, на концэ́ – на дворэ̂, на концэ̂ – на двор'и́, на конц'и́/;* жаночага, мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку першага і другога скланенняў з цвёрдай і мяккай асновай у месным склоне *у (в) ха́ц'і, у (в) л'е́с'і, у (в) по́л'і – у (в) ха́ты, у (в) л'і́сы, в (у) по́лы, у (в) ха́т'и, у (в) л'е́с'и, у (в) по́л'и – у (в) ха́ц'е, у (в) л'е́с'е, у (в) по́л'е/;* жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне */бабэ́й, баб'е́й, стрэхэ́й, стрэх'е́й, хатэ́й – баб, стрэх, хат – бабо́ў, стрэ́хоў, хато́ў/* і інш.

У <u>другім падраздзеле</u> прыводзяцца націскныя і ненаціскныя канчаткі прыметнікаў жаночага і ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне */молода́йа, стара́йа – молода́, стара́; до́брайа, но́вайа – до́бра, но́ва; молодэ́йе, старэ́йе – молодэ́, старэ́ – маладо́йе, старо́йе; но́вэйе, но́в'ейе, соло́дкэйе, соло́дк'ейе, хоро́шэйе – но́вэ, но́в'е, соло́дкэ, соло́дк'е, хоро́шэ – соло́дкойе, хоро́шойе – но́вайе, сало́дкайе, харо́шайе/* і інш.

<u>Трэці падраздзел</u> прысвечаны формам займеннікаў: формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *ён, яна́, яно́, яны́ /йон, йана́, йано́, йаны́ – йон, йона́, йоно́, йоны́ – вэ̂н, в'ê н, вôн, вона́, воно́, воны́ – он, она́, оно́, оны́/;* формы ўласна-асабовага займенніка другой асобы множнага ліку *вы /вы – в'и – в'і/;* формы азначальнага займенніка *усе́ /вс'е – вс'і – вс'и/* і інш.

У <u>чацвёртым падраздзеле</u> даследуюцца формы дзеясловаў: формы інфінітыва з асновай на галосны */ходз'і́ц', роб'і́ц' – ходз'і́ц'і, роб'і́ц'і – ходз$^{д}$'іц$^{т}$'і, роб'іц$^{т}$'і – ход'і́т'і, роб'і́т'і – ход'и́т'и, роб'и́т'и – ходы́ты, робы́ты/;* формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве */бра́цца, зва́цца – бра́ц'іса, зва́ц'іса, бра́ц'іс, зва́ц'іс/;* формы інфінітыва з асновай на [к] */пэкц'і́, пэкц'е́, с'е́кц'і, сэкт'е́ – п'ачы́, с'ачы́/;* формы дзеясловаў *хадзі́ць, насі́ць* у першай асобе адзіночнага ліку */ходз'у́, нос'у́ – ходжу́, ношу́ – хажу́, нашу́/;* цвёрдасць-мяккасць зычнага [с] у зваротнай форме дзеяслова */бойу́са, купа́йуса – бойу́с', купа́йус'/;* формы дзеясловаў другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку з націскам на аснове */хо́дз'іт, хо́дз'ат – хо́дз''іц'', хо́дз''ац'', хо́дз'іц', хо́дз'ац' – хо́д'іт', хо́д'ат'/;* формы дзеясловаў першага спражэння з

асновай на [*г*], [*к*] у трэцяй асобе множнага ліку /*пэку́т, стрыгу́т – пэчу́т', стрыжу́т'*/ і інш.

У раздзеле 2.3 ***"Лексіка"*** разглядаюцца наступныя тэматычныя групы: назвы з'яў і аб'ектаў прыроды, адрэзкаў часу; ядомых і неядомых грыбоў; агародніны, дрэў, ягад і раслін (раслінны свет); дзікіх і свойскіх птушак і жывёл (жывёльны свет); прадметаў сельскай гаспадаркі і побыту, матэрыяльнай культуры; сваяцкіх адносін, роднасці. Некаторыя найменні не ўтвараюць асобных тэматычных груп. Раздзел уключае сем адпаведных падраздзелаў.

Лінгвагеаграфічнае даследаванне лексікі гаворак Выганаўскага Палесся паказвае, што ў складзе фактычнага матэрыялу вылучаюцца найменні, розныя па характары лакалізацыі і распаўсюджвання.

У гаворках рэгіёна зафіксаваны: 1) нарматыўныя і дыялектныя формы: *чабо́р /чобо́р, ча^эбо́р, чэбо́р, чо́бор, чобу́р, чэбу́р, чабу́р, ча^эбу́р, чы^эбу́р, чыбу́р, чобэ́р, чобы́р, чабарэ́ц, чобор'э́ц, чы^эбърэ́ц, чы^эбырэ́ц, чэборэ́ц, чабрэ́ц/* і інш.; 2) дыялектныя формы: *арабу́шок, гарабу́шок, рабу́шок, воробу́шок, гарабэ́шык, арабэ́й, варабэ́й, гарабэ́й, арабу́шок, ворабэ́шык, гарабэ́шок* 'верабей' і інш.

На тэрыторыі Выганаўскага Палесся пашыраны наступныя дыялектныя адрозненні:

1) лексіка-фанематычныя: *журахв'і́ны – журахв'и́н'и – журахвы́ны – жураўл'і́ны – журав'і́ны – журахл'і́ны* 'журавіны' і інш.; 2) лексіка-фанематычныя і ўласналексічныя (сінонімы): *пыдло́га – п'ідло́га – подло́га – пôдло́га – падло́га – помэ́ст – пом'е́ст – помо́ст – помуо́ст* 'падлога' і інш.; 3) лексіка-фанематычныя і лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя): *дз'у́ба – д'у́ба – дз'у́бэн' – дз'у́б'ен' – д'у́бэн' – дз'о́вбэн'– дз'о́вбыл' – дз'оўба́к – дз'у́вб'ік – дз'овб – дз'уб – д'уб – дз'у́бка* 'дзюба ў птушак' і інш.; 4) лексіка-фанематычныя, лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя) і ўласналексічныя (сінонімы): *пэрэ́хмарок – п'арэ́хмарок – п'ерэ́хмарок – пэр'э́хмарок – хма́рка – о́блако – во́блако – о́болок – оболо́к – о́блок* 'воблака' і інш.; 5) лексіка-семантычныя (амонімы): *п'е́в'ен', п'е́вэн'* 'журавель' – *п'е́в'ен', п'е́вэн'* 'самец курыцы'; 6) лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя) і ўласналексічныя (сінонімы): *карто́пл'і – карто́пл'а – бу́л'ба* 'бульба' і інш.; 7) уласналексічныя (сінонімы): *соха́ – ба́ба – стовп* 'саха ў калодзежным жураўлі'; 8) лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя): *кл'у́чка – кл'уч* 'вочап у калодзежным жураўлі'.

У трэцяй главе **"Пучкі ізаглос і групоўка гаворак Выганаўскага Палесся"** вызначаюцца пучкі ізаглос, асаблівасці гаворак асобных населеных пунктаў, групоўка гаворак, дыялектная мікразона, канфігурацыя арэалаў інавацыйных з'яў, а таксама выказаны некаторыя меркаванні па пытаннях генезісу гаворак Выганаўскага Палесся.

У раздзеле 3.1 *"Характарыстыка пучкоў ізаглос"* адзначаецца, што на тэрыторыі рэгіёна праходзяць ізаглосы featнага ўзроўневага характару: фанетычныя (ізафоны), марфалагічныя (ізаморфы), лексічныя (ізалексы).

На тэрыторыі Выганаўскага Палесся пучкі ізаглос утвараюць чатыры асноўныя групы (серыі): *паўночную, паўднёвую, цэнтральную* і *лакальныя* пучкі ізаглос. Кожная група характарызуецца цэлым комплексам фанетычных, марфалагічных і лексічных адметнасцей.

У раздзеле 3.2 *"Групоўка гаворак і іх арэальныя сувязі"* адзначаецца, што гаворкі рэгіёна маюць шэраг агульных моўных (фанетычных, марфалагічных і лексічных) асаблівасцей, якія аб'ядноўваюць іх паміж сабою.

Аднак у гаворках Выганаўскага Палесся намі выяўлены і значныя адметныя адрозненні на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі. Таму гаворкі рэгіёна падзяляюцца шматлікімі фанетычнымі (ізафонамі), марфалагічнымі (ізаморфамі) і лексічнымі (ізалексамі) ізаглосамі, аб'яднанымі ў 32 пучкі з агульнай колькасцю ў 336 ізаглос (паўночная група – 11 пучкоў (110 ізаглос), паўднёвая – 5 пучкоў (88 ізаглос), цэнтральная – 8 пучкоў (55 ізаглос) і лакальныя пучкі ізаглос – 8 пучкоў (83 ізаглосы).

Паводле вынікаў праведзенага даследавання на тэрыторыі Выганаўскага Палесся вылучаюцца наступныя дыялектныя тыпы: гаворкі паўночнабрэсцкія (пераважна іх цэнтральнацеляханская падгрупа, унутры яе – усходне- і заходнецеляханская мікрападгрупы), гродзенска-баранавіцкія, паўднёвацеляханскія, валішчанска-аброўскія, сярэднезагародская гаворка в. Сакалоўка, гаворка мястэчка Целяханы, а таксама целяханская дыялектная мікразона (уключае цэнтральнацеляханскую падгрупу паўночнабрэсцкіх і паўднёвацеляханскую групу гаворак) (гл. карту).

Ніжэй прыводзіцца агульная колькасць ізаглос, якія раздзяляюць асобныя групы гаворак у колькаснай паслядоўнасці (гэтыя дадзеныя прадстаўлены ў табліцы 2 – *Колькасць ізаглос, якія раздзяляюць асобныя групы гаворак*):

1) гродзенска-баранавіцкія ад паўночнабрэсцкіх – 111; 2) паўднёвацеляханскія ад сярэднезагародскіх – 56; 3) паўночнабрэсцкія ад валішчанска-аброўскіх – 36; 4) паўднёвацеляханскія ад валішчанска-аброўскіх – 32; 5) валішчанска-аброўскія ад сярэднезагародскіх – 30; 6) паўночнабрэсцкія ад гаворкі мястэчка Целяханы – 29; 7) гаворка мястэчка Целяханы ад паўднёвацеляханскіх – 17; 8) паўночнабрэсцкія ад паўднёвацеляханскіх – 16.

Гэтыя дадзеныя сведчаць аб тым, што паміж выдзеленымі дыялектнымі групамі і падгрупамі існуюць выразныя межы. Раздзел складаецца з сямі падраздзелаў.

У першым падраздзеле даследуюцца гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) гаворкі, якія пашыраны на поўначы Выганаўскага Палесся. Асноўны іх масіў знаходзіцца ў басейне р. Нёман. На поўдні яны непасрэдна

мяжуюць з паўночнабрэсцкімі гаворкамі (гл. карту). Гродзенска-баранавіцкая група гаворак упершыню была выдзелена ў 1964 г. Р.І. Аванесавым. Яна адносіцца да паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы. У гэтым мікрарэгіёне на ўзмежжы гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх гаворак размешчаны значныя лясныя і балотныя масівы, Выганашчанскае і Бабровіцкае азёры.

**Карта – Гаворкі Выганаўскага Палесся і наваколляў**




А — гродзенска-баранавіцкія (панямонскія)
Б — паўночнабрэсцкія
В — гаворка г.п. Целяханы
Г — паўднёвацеляханскія
Д — валішчанска-аброўскія
Е — паўночназагародскія і сярэднезагародскія

– – – – – Межы гаворак
·············· Цэнтральнацеляханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак

Сучасная дыялектная мяжа паміж гродзенска-баранавіцкімі і паўночнабрэсцкімі (цэнтральнацеляханскімі) гаворкамі супадае (або амаль супадае) з былымі межамі Чорнай Русі і Пінскага княства (XII–XIII стст.), Новагародскага (Навагрудскага) і Берасцейскага (Брэсцкага) ваяводстваў (з канца XVI – да канца XVIII ст.), Слонімскага і Кобрынскага паветаў Гродзенскай губерні і Навагрудскім і Пінскім паветамі Мінскай губерні (з канца XIX – да пачатку XX ст.). Дадзеныя фактары, у прыватнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльныя межы, а таксама лясныя і балотныя масівы аказалі значны ўплыў на фарміраванне дыялектнай мяжы гродзенска-баранавіцкіх гаворак з паўночнабрэсцкімі гаворкамі.

Гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) пучкі ізаглос (паўночная група) у нашай працы паказваюць, што значная колькасць ізаглос, якія акрэсліваюць моўныя асаблівасці, уласцівыя панямонскім гаворкам, паступова пашыраецца на ўсе гаворкі Выганаўскага Палесся, утвараючы асобныя пучкі.

У другім падраздзеле даследуюцца паўночнабрэсцкія гаворкі, якія на поўначы мяжуюць з гродзенска-баранавіцкімі (панямонскімі) гаворкамі. Яны ўпершыню былі выдзелены ў 1968 г. Н.Т. Вайтовіч. Паўночнабрэсцкія гаворкі суадносяцца з паўночнапалескім дыялектным тыпам.

Асноўная частка паўночнабрэсцкіх гаворак на тэрыторыі Выганаўскага Палесся па сваіх моўных адметнасцях адносіцца да цэнтральнацеляханскай падгрупы. Паўночнабрэсцкія гаворкі, у тым ліку цэнтральнацеляханская падгрупа, мяжуюць з наступнымі гаворкамі рэгіёна (гл. карту): з гродзенска-баранавіцкімі (на поўначы), паўднёвацеляханскімі (на паўднёвым захадзе), валішчанска-аброўскімі (на паўднёвым захадзе і паўднёвым усходзе) і мікраарэалам гаворкі мястэчка Целяханы (на поўдні).

У межах Выганаўскага Палесся да паўночнабрэсцкіх гаворак адносяцца гаворкі вв. Бабровічы, Вулька Аброўская, Вулька Целяханская, Выганашчы, Вяда, Вялікая Гаць, Горталь, Гутка, Доўгая, Жытлін, Козікі, Краі, Малая Гаць, Раздзялавічы, Святая Воля, Соміна, Тупічычы. Большасць гэтых гаворак належаць да цэнтральнацеляханскай падгрупы (акрамя гаворак вв. Жытлін і Раздзялавічы).

Шэраг спецыфічных адметнасцей цэнтральнацеляханскай падгрупы паўночнабрэсцкіх гаворак утвараюць дзве дыялектныя мікрападгрупы: усходнецеляханскую і заходнецеляханскую.

Цэнтральнацеляханская падгрупа як састаўная частка паўночнабрэсцкіх гаворак характарызуецца цэлым комплексам моўных асаблівасцей. А паўночнабрэсцкія гаворкі, як вядома, вельмі блізкія да гаворак усходнепалескай часткі слуцка-мазырскай групы паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы. Яны з'яўляюцца, безумоўна, адзінымі з гэтымі гаворкамі па сваёй дыялектнай аснове і выступаюць фактычна іх працягам, хоць і своеасаблівым, па геаграфіі.

Паўночнабрэсцкія гаворкі ўтвараюць адносна нешырокі пояс, які прымыкае да ізаглоснай мяжы паміж заходнепалескімі гаворкамі і гаворкамі асноўнага масіву беларускай мовы. Загадкавым і незвычайным з'яўляецца, безумоўна, гэты пояс усходнепалескіх гаворак па яго ўтварэнні і паходжанні, што патрабуе спецыяльнага даследавання. Аднак гэта загадка для гістарычнай дыялекталогіі.

Цэнтральнацеляханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак выступае як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

У трэцім падраздзеле разглядаюцца паўднёвацеляханскія гаворкі, якія пашыраны ў невялікім арэале, што размешчаны на паўднёвы захад ад мястэчка Целяханы. Яны бытуюць на ўзмежжы Івацэвіцкага (пераважна) і Пінскага раёнаў. Паўднёвацеляханскія гаворкі як асобная дыялектная адзінка былі вылучаны Ф.Д. Клімчуком у 1983 г. Даследчыкі звычайна адносяць гэтыя гаворкі да берасцейска-пінскіх. Паўднёвацеляханскія гаворкі суадносяцца са стрыгінскім дыялектным тыпам.

На тэрыторыі рэгіёна паўднёвацеляханскія гаворкі на поўначы мяжуюць (гл. карту) з паўночнабрэсцкімі і мікраарэалам гаворкі мястэчка Целяханы, на захадзе і ўсходзе – з валішчанска-аброўскімі, на поўдні – з сярэднезагародскімі гаворкамі.

Паўднёвацеляханскія гаворкі выступаюць як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

У чацвёртым падраздзеле даследуецца гаворка мястэчка Целяханы, якая лакалізуецца ў цэнтры рэгіёна. Яна ўпершыню была выдзелена аўтарам дысертацыі ў лінгвістычным атласе "Гаворкі Выганаўскага Палесся" (2009). Гэтая гаворка суадносіцца з беражноўскім дыялектным тыпам.

Гаворка мястэчка Целяханы знаходзіцца на ўзмежжы арэалаў паўночнабрэсцкіх (цэнтральнацеляханская падгрупа) і паўднёвацеляханскіх гаворак (гл. карту). Таму яна характарызуецца значнай ступенню пераходнасці. Гаворка мястэчка па шэрагу адметнасцей аб'ядноўваецца з цэнтральнацеляханскай падгрупай паўночнабрэсцкіх гаворак, па многіх асаблівасцях – з паўднёвацеляханскімі гаворкамі. Шэраг адметнасцей аб'ядноўвае гэту гаворку з панямонскімі гаворкамі, супрацьпастаўляючы яе асноўным масівам суседніх гаворак, паўночнабрэсцкім і паўднёвацеляханскім.

Гаворка мястэчка Целяханы выступае як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

Пяты падраздзел прысвечаны валішчанска-аброўскім гаворкам, якія пашыраны ў двух невялікіх арэалах, усходнім (асноўным) і заходнім, скіраваным на паўднёвы ўсход (пераважна) і захад (гаворка в. Аброва) ад мястэчка Целяханы. Большасць з іх (акрамя гаворкі в. Аброва) бытуе на ўзмежжы Івацэвіцкага і Пінскага раёнаў. Валішчанска-аброўскія гаворкі (па

ранейшай класіфікацыі – паўночналагішынскія) як асобная дыялектная адзінка былі вылучаны Ф.Д. Клімчуком у 1983 г. Даследчыкі звычайна адносяць гэтыя гаворкі да берасцейска-пінскіх (М.М. Аляхновіч, Ф.Д. Клімчук і інш.). Валішчанска-аброўскія гаворкі суадносяцца з малецкім дыялектным тыпам.

На тэрыторыі рэгіёна валішчанска-аброўскія гаворкі мяжуюць з наступнымі дыялектнымі адзінкамі. Усходні арэал: на поўначы – з паўночнабрэсцкімі, на захадзе – з паўднёвацеляханскімі і сярэднезагародскімі, на поўдні і ўсходзе – з паўночназагародскімі гаворкамі. Заходні арэал: на поўначы – з паўночнабрэсцкімі, на ўсходзе – з паўднёвацеляханскімі, на захадзе і поўдні – з паўночназагародскімі, сярэднезагародскімі, паўднёвазагародскімі і тараканскімі гаворкамі (гл. карту).

Намі даследаваўся толькі асноўны, усходні арэал.

Валішчанска-аброўскія гаворкі выступаюць як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

У шостым падраздзеле разглядаецца сярэднезагародская гаворка в. Сакалоўка, якая размешчана на крайнім поўдні рэгіёна. Сярэднезагародскія гаворкі пашыраны на значнай тэрыторыі Заходняга Палесся: ад Берасця на захадзе і амаль да Століна на ўсходзе. Яны ўтвараюць некалькі масіваў і астравоў. Найбольш значныя масівы дадзеных гаворак – брэсцка-камянецка-кобрынскі і пінска-заходнястолінскі. Прыкметныя тэрытарыяльныя абшары сярэднезагародскіх гаворак адзначаны ў Драгічынскім і Іванаўскім раёнах, таксама яны характэрны некаторым населеным пунктам на паўночным захадзе Пінскага і на захадзе Лунінецкага раёнаў. Сярэднезагародскія гаворкі як адна з чатырох асобных дыялектных разнавіднасцяў заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак былі вылучаны Ф.Д. Клімчуком у 1983 г. Гэтыя гаворкі суадносяцца з паўднёвапалескім дыялектным тыпам.

Сярэднезагародскія гаворкі на тэрыторыі рэгіёна мяжуюць: на поўначы з паўднёвацеляханскімі, на ўсходзе – з валішчанска-аброўскімі, на паўднёвым захадзе – з паўднёвазагародскімі гаворкамі (гл. карту).

У межах Выганаўскага Палесся сярэднезагародскія гаворкі выступаюць як частка выразна акрэсленай дыялектнай адзінкі даўняга ўтварэння.

У сёмым падраздзеле прыводзяцца асаблівасці целяханскай дыялектнай мікразоны, якая ўключае цэнтральнацеляханскую падгрупу паўночнабрэсцкіх гаворак і паўднёвацеляханскую групу гаворак.

У раздзеле 3.3 *"Канфігурацыя арэалаў інавацыйных з'яў і праблема іх адноснай храналогіі"* адзначаецца, што Выганаўскае Палессе з'яўляецца ўскраінай пашырэння інавацыйных з'яў, якія пранікалі ў гэты рэгіён з двух цэнтраў – паўночнага, ці гродзенска-баранавіцкага, і паўднёвага, ці берасцейска-пінскага. Яны размешчаны адпаведна на поўнач і поўдзень ад Выганаўскага Палесся. Трэці цэнтр – сярэднябрэсцкія інавацыі – узнік у гэтым

рэгіёне (састаўной часткі сярэдняй паласы Берасцейшчыны). Ён супрацьпастаўляецца як гродзенска-баранавіцкай поўначы, так і берасцейска-пінскаму поўдню. Інавацыйныя з'явы выцеснілі ранейшыя моўныя з'явы (ці архаізмы). Аднак у гаворках Выганаўскага Палесся некаторыя архаічныя з'явы захаваліся.

У раздзеле 3.4 ***"Некаторыя пытанні генезісу гаворак Выганаўскага Палесся"*** звяртаецца ўвага на спецыфіку фарміравання дыялектнага ландшафту гэтага рэгіёна.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

Праведзенае даследаванне гаворак Выганаўскага Палесся дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Для большай часткі гаворак Выганаўскага Палесся уласцівы сяміфанемны склад галосных гукаў: [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê(э̂)*], [*а*], [*о*], [*у*]; цэнтру, паўднёваму ўсходу і часткова поўдню – васьміфанемны: [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê*], [*а*], [*о*], [*ô*], [*у*]; паўночнаму ўсходу – таксама васьміфанемны: [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*а*], [*о*], [*у*], [*i͡e*], [*у͡о*]; паўночнаму захаду і поўдню (часткова) рэгіёна – шасціфанемны: [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*а*], [*о*], [*у*].

Кансанантызм гаворак Выганаўскага Палесся характарызуецца наяўнасцю агульных і спецыфічных, рэгіянальных адметнасцей. Да агульных асаблівасцей адносяцца наяўнасць пратэтычных [*в*], [*г*] у шэрагу слоў, падоўжаных мяккіх [*з'*], [*н'*], зацвярдзелых [*р*], [*ж*], [*ш*], [*ц*]. Спецыфічныя, рэгіянальныя адметнасці выяўляюцца ў адрозненні па цвёрдасці, паўмяккасці і мяккасці, глухасці і звонкасці зычных, наяўнасці або адсутнасці мяккіх афрыкат [*дз'(дз'')*], [*ц'(ц'')*], паўгалоснага [*ў*] (нескладовага).

Марфалагічныя асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся прыведзены на прыкладах ужывання назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў і дзеясловаў. На паўночным захадзе, поўначы і паўночным усходзе даследаванай тэрыторыі пераважаюць рысы, якія з'яўляюцца нормай беларускай літаратурнай мовы. Аднак для астатніх гаворак рэгіёна больш уласцівы спецыфічныя, рэгіянальныя марфалагічныя адметнасці.

Паводле лінгвагеаграфічных даследаванняў лексікі Выганаўскага Палесся вылучаюцца: а) агульнапашыраныя назвы; б) словы, характэрныя большай частцы даследаванай тэрыторыі; в) найменні, якія распаўсюджаны на пэўнай частцы рэгіёна. Адзначаны таксама лексемы, што сустракаюцца спарадычна, і назвы, якія закартаграфаваны як адзінкавыя.

У даследаваных гаворках занатаваны нарматыўныя і дыялектныя формы (напрыклад, *чабóр /чобóр, чаэбóр, чэбóр, чóбор, чобýр, чэбýр, чабýр, чаэбýр,*

*чы³бýр, чыбýр, чобэ́р, чобы́р, чабарэ́ц, чобор'э́ц, чы³бърэ́ц, чы³бырэ́ц, чэборэ́ц, чабрэ́ц/*) або толькі дыялектныя формы (напрыклад, *орабýшок, гарабýшок, рабýшок, воробýшок, гарабэ́шык, арабэ́й, варабэ́й, гарабэ́й, арабýшок, ворабэ́шык, гарабэ́шок* 'верабей').

Дыялектныя формы маюць месца ва ўсіх гаворках Выганаўскага Палесся, нарматыўныя ж пераважаюць у паўночна-заходняй, паўночна-ўсходняй і цэнтральнай частках; часам яны сустракаюцца ва ўсіх ці амаль ва ўсіх або ў палове гаворак, а таксама на поўдні рэгіёна.

На даследаванай тэрыторыі пашыраны наступныя дыялектныя адрозненні: лексіка-фанематычныя (напрыклад, *журахв'íны – журахв'ѝн'и – журахвы́ны – жураўл'íны – журав'íны – журахл'íны* 'журавіны'); лексіка-фанематычныя і ўласналексічныя (сінонімы) (напрыклад, *пыдло́га – п'ідло́га – подло́га – по̂дло́га – падло́га – помэ́ст – пом'е́ст – помо́ст – помуост* 'падлога'); лексіка-фанематычныя і лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя) (напрыклад, *дз'ýба – д'ýба – дз'ýбэн' – дз'ýб'ен' – д'ýбэн' – дз'о́вбэн' – дз'о́вбыл' – дз'оўба́к – дз'ýвб'ік – дз'овб – дз'уб – д'уб – дз'ýбка* 'дзюба ў птушак'); лексіка-фанематычныя, лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя) і ўласналексічныя (сінонімы) (напрыклад, *пэрэ́хмарок – п'арэ́хмарок – п'ерэ́хмарок – пэр'э́хмарок – хма́рка – о́блако – во́блако – о́болок – оболо́к – о́блок* 'воблака'); лексіка-семантычныя (амонімы) (*п'е́в'ен', п'е́вэн'* 'жуpавель' – *п'е́в'ен', п'е́вэн'* 'самец курыцы'); лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя) і ўласналексічныя (сінонімы) (напрыклад, *карто́пл'і – карто́пл'а – бýл'ба* 'бульба'); уласналексічныя (сінонімы) (*соха́ – ба́ба – стовп* 'саха ў калодзежным жураўлі'); лексіка-словаўтваральныя (марфалагічныя) (*кл'ýчка – кл'уч* 'вочап у калодзежным жураўлі') [1–5, 7–10, 12–21].

2. У выніку лінгвагеаграфічнага даследавання цэлага комплексу моўных адметнасцей (на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі) гаворак Выганаўскага Палесся на яго тэрыторыі вылучана 336 ізаглос. Дадзеныя ізаглосы ўтвараюць 32 пучкі, якія ў сваю чаргу аб'ядноўваюцца ў 4 групы (серыі) пучкоў ізаглос: *паўночную* (11 пучкоў, 110 ізаглос), *паўднёвую* (5 пучкоў, 88 ізаглос), *цэнтральную* (8 пучкоў, 55 ізаглос) і *лакальныя* пучкі ізаглос (8 пучкоў, 83 ізаглосы). *Паўночная* група ўключае наступныя пучкі ізаглос: 1) гічыцкі, 2) гічыцка-целяханскі, 3) жытлінска-гічыцка-выганашчанскі, 4) жытлінска-гічыцка-целяханскі, 5) жытлінска-гічыцка-крайскі, 6) гічыцка-вядска-раздзялавіцкі, 7) гічыцка-целяханска-раздзялавіцкі, 8) жытлінска-гічыцка-вядска-раздзялавіцкі, 9) жытлінска-гічыцка-целяханска-раздзялавіцкі, 10) панямонска-цэнтральнацеляханскі (I), 11) панямонска-цэнтральнацеляханскі (II); *паўднёвая* група – 1) загародскі (сакалоўскі), 2) валішчанска-аброўска – загародскі, 3) паўднёвацеляханска – валішчанска-аброўска – загародскі, 4) загародска-цэнтральцеляханскі (I), 5) загародска-

цэнтральнацеляханскі (II); *цэнтральная* група – 1) жытлінска-целяханска-рэчкаўскі, 2) гічыцка-целяханска-валішчанскі, 3) бабровіцка-сомінска-азарыцкі, 4) жытлінска-вядска-крайскі, 5) гошчаўска-целяханска-крайскі, 6) выганашчанска-целяханска-сакалоўскі, 7) вядска-целяханска-гошчаўскі, 8) жытлінска-целяханска-гортальскі; *лакальныя* пучкі ізаглос – усходнецеляханская мікрападгрупа: 1) выганашчанска-сомінска-крайскі, 2) раздзялавіцка-валішчанскі, 3) целяханска-азарыцка-валішчанскі, 4) азарыцка-рэчкаўскі, 5) рэчкаўска-валішчанскі; заходнецеляханская мікрападгрупа: 1) вялікагацка-доўгаўскі, 2) вядска-бабровіцкі, 3) целяханска-гошчаўскі. Колькасць ізаглос у складзе пучкоў вагаецца ад 3 да 39.

На аснове пучкоў ізаглос і іх фрагментаў праведзены выразныя межы паміж групамі (падгрупамі) гаворак [1–5, 7–10, 12, 15–21].

3. На тэрыторыі Выганаўскага Палесся зафіксавана пашырэнне значнай сукупнасці моўных з'яў фанетычнага, марфалагічнага і лексічнага характару; на іх аснове праведзены дакладныя межы паміж асобнымі групамі (падгрупамі) гаворак, дапоўнены і сістэматызаваны іх асаблівасці.

На тэрыторыі Выганаўскага Палесся выдзяляюцца наступныя гаворкі: гродзенска-баранавіцкія – на паўночным захадзе (н.п. 1), паўночнабрэсцкія (пераважна іх цэнтральцеляханская падгрупа, унутры яе – усходне- і заходнецеляханская мікрападгрупы) – на асноўнай частцы (н.п. 2–13, 15, 16, 18–20), гаворка мястэчка Целяханы (н.п. 14) – у цэнтры, паўднёвацеляханскія – на паўднёвым захадзе (н.п. 17, 21, 22), валішчанска-аброўскія – на паўднёвым усходзе (н.п. 23, 25, 26), сярэднезагародскія – на поўдні (н.п. 24) рэгіёна.

Нарастанне адрозненняў паміж гродзенска-баранавіцкімі, паўночнабрэсцкімі (цэнтральнацеляханскімі), сярэднябрэсцкімі (паўднёвацеляханскімі і валішчанска-аброўскімі) і загародскімі (сярэднезагародскімі) гаворкамі мае выразны "ступеньчаты" характар пераходнасці.

На тэрыторыі Выганаўскага Палесся ўпершыню акрэслены межы **цэнтральнацеляханскай падгрупы** паўночнабрэсцкіх гаворак: вв. Баброўічы, Вулька Аброўская, Вулька Целяханская, Выганашчы, Вяда, Вялікая Гаць, Горталь, Гутка, Доўгая, Козікі, Краі, Малая Гаць, Святая Воля, Соміна, Тупічычы. Унутры яе выдзелены **ўсходне-** і **заходнецеляханская** мікрападгрупы. Цэнтральнацеляханскай падгрупе характэрны сяміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê(э̂)*], [*а*], [*о*], [*у*]; захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ *(доро́га, молоко́, се̂но, се́но, трава́);* галосны [*э̂(ê)*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(вэ̂з, вêз, стэ̂л, кэ̂нь, кêнь);* пераважна галосны [*ê*] на месцы націскнога ***ѣ** *(лêс, се̂но);* пераважна цвёрдыя губныя перад рэфлексамі ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***ѣ** /у ненаціскных складах/ *(вэсна́, васна́, бэ̂рог, бэда́, бада́);* мяккія

пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е** *(земля́, по́ле);* мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і** *(мі́ска, робі́ці /робі́ць, робі́ц$^{т}$і/, лі́па, зіма́);* пераважна пераход мяккіх і паўмяккіх ***д, *т** у палаталізаваныя [*дз’*], [*ц’*], зрэдку – у мяккія [*дз*$^{д}$*’*], [*ц*$^{т}$*’*] *(дз’ен’, ц’епэ́р, ц’епэ́ра, ц’еп’е́р, ходз’і́ц’і, ц’і́хо, дз’ед, ц’ен’; дз*$^{д}$*’ен’, ц*$^{т}$*’епэ́р, ходз*$^{д}$*’і́ц*$^{т}$*’і, ц*$^{т}$*’і́хо, дз*$^{д}$*’ед, ц*$^{т}$*’ен’);* мяккія заднеязычныя ў гістарычных спалучэннях ***гы, *кы, *хы** *(до́вгі /до́ўгі/, коро́ткі, ці́хі /ц*$^{т}$*і́хі/);* пераважна ацвярдзенне мяккага ***т** на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(хо́дз’іт, хо́дз’ат /хо́дз*$^{д}$*’іт, хо́дз*$^{д}$*’ат/);* пераважна цвёрды і паўмяккі зычны ***р**, зрэдку захаванне мяккага ***р** *(град, грэх, поря́док, коря́вка; гр˙ад, гр˙эх, пор˙а́док, кор˙э́вка* і інш.; *грех, поря́док);* пераважна цвёрдыя шыпячыя *(жар, жы́то, на мэжэ́ /на межэ́/, ша́пка* і інш.); толькі цвёрды гістарычны мяккі ***ц** *(молодзі́ца /молодз*$^{д}$*і́ца/, хло́пцы, ца́цка, цэп);* пераважна губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(пра́wда, до́wгі, купі́w);* пераважна канчатак *-эй (-ей)* назоўнікаў жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне *(бабэ́й, бабе́й, стрэхэ́й, стрэхе́й, хатэ́й);* паралельнае ўжыванне націскных канчаткаў *-эе, -э* або толькі націскнога канчатка *-эе* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодэ́е, старэ́е; молодэ́, старэ́);* пераважна паралельнае ўжыванне ненаціскных канчаткаў *-эе (-ее), -э (-е)* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(но́вэе, но́вее, садо́ркэе, соло́дкее, хоро́шэе; но́вэ, но́ве, соло́дкэ, соло́дке, хоро́шэ);* формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вэ̂н, вê̂н, вона́, воно́, воны́;* формы інфінітыва з асновай на галосны пераважна з суфіксам *-ці*, зрэдку – *-ц*$^{т}$*і (ходзі́ці, робі́ці; ходз*$^{д}$*і́ц*$^{т}$*і, робі́ц*$^{т}$*і);* формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве пераважна з постфіксам *-са (-с) (бра́ціса /бра́ц*$^{т}$*іса, бра́ціс/, зва́ціса /зва́ц*$^{т}$*іса, зва́ціс/);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пэкці́, пе́кці; пэкце́ /пекце́, пэкц*$^{т}$*е́/; се́кці /се́кц*$^{т}$*і/);* цвёрды зычны [*с*] у зваротнай форме дзеяслова *(бою́са, купа́юса, боя́вса, купа́вса, зробі́лосо)* і інш.; ужыванне слоў: *е́жык* ‘вожык’, *журахві́ны* ‘журавіны’, *ла́пно* ‘вапна’, *насі́лы* ‘насілы’, *небо́ж* ‘пляменнік’, *пэрэ́хмарок* ‘воблака’, *сокора́т* ‘куры сакочуць’, *спова́ці* ‘спяваць’ і інш.

Гаворкам *усходнецеляханскай* мікрападгрупы ўласцівы галосны [*і*] на месцы ***ы** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных *(міш, піл, вісо́ко);* галосны [*ы˙*] на месцы націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы́, ры́ба, дым (сы˙н, волы́˙, ры́˙ба);* мяккія губныя перад рэфлексамі ***е, *ѣ** *(весна́, бе́рог, беда́);* мяккія губныя і заднеязычныя перад канчаткам *-ей* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону *(бабе́й, стрехе́й);* мяккія заднеязычныя перад [*е*] *(до́вгее, до́вге, коро́ткее, коро́тке, ці́хее /ці́хе/);* мяккія губныя і заднеязычныя перад рэфлексамі ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(вê̂з, кê̂нь);* наяўнасць паўмяккага зычнага ***р** *(гр˙ад, гр˙эх,*

*пор'áдок* і інш.); уласна-асабовы займеннік другой асобы множнага ліку *ві* і інш.; ужыванне слоў: *картóплі; картóпля* 'бульба', *картопля́ная кáша, картопля́на кáша* 'таўчоная бульба (пюрэ)', *кокóчут* 'сакочуць (пра курэй)', *пéвень, пéвэнь* у значэнні 'журавель', *сóненько* 'сонейка' і інш. Гаворкам *заходнецеляханскай* мікрападгрупы характэрны галосны [*а*] на месцы ***е, *ѣ** ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных *(васнá, бадá);* палаталізаваны [*ц'*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(хóдз'іц', хóдз'ац');* наяўнасць мяккіх і паўмяккіх шыпячых *(жяр, на мэжé, на межé, шя́пка; ж'úто);* частковае аглушэнне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі *(кáз$^с$ка, загáд$^т$ка);* адпадзенне пачатковага гука ў слове *анýча (нýча)* і інш.; ужыванне слоў: *бýльба* 'бульба', *воробýшок; рабýшок* 'верабей', *дзёвб, дзёвбыль, дзёвбэнь* 'дзюба ў птушак', *краснíк* 'падасінавік', *солонéчнік* 'сланечнік' і інш.

У выніку даследавання на тэрыторыі рэгіёна ўпершыню вызначаны моўныя асаблівасці **гаворкі мястэчка Целяханы**. Ёй уласцівы васьміфанемны склад галосных гукаў: [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê*], [*а*], [*о*], [*ô*], [*у*]; галосныя [*о*], [*ô*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(воз, стол, конь; вôз, стôл, кôнь);* галосныя [*е*], [*ê*] на месцы націскнога ***ѣ** *(лес, сéно; лêс, сêно);* захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ *(дорóга, молокó, сéно, сêно, травá);* цвёрдыя губныя перад рэфлексамі ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***ѣ** /у ненаціскных складах/ *(вэснá, бэ́рог, бэдá);* мяккія пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е** *(земля́, пóле);* мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і** *(мíска, робíті, лíпа, зімá);* адсутнасць дзекання-цекання *(д'ен', т'епэ́р, ход'íт'і, т'íхо, д'ед, т'ен');* мяккія заднеязычныя ў гістарычных спалучэннях ***гы, *кы, *хы** *(дóвгі, корóткі, тíхі);* цвёрды [*т*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(хóд'іт, хóд'ат);* наяўнасць паўмяккага зычнага ***р** *(гр'ад, гр'эх, пор'áдок* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя *(жар, жыто, на мэжэ́, шáпка);* толькі цвёрды гістарычны мяккі ***ц** *(молодíца, хлóпцы, цáцка, цэп);* губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(прáwда, дówгі, купíw);* канчатак *-эй* назоўнікаў жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне *(бабэ́й, стрэхэ́й, хатэ́й);* націскныя і ненаціскныя канчаткі *-эе, -э* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодэ́е, старэ́е, молодэ́, старэ́; нóвэе, солóдкэе, хорóшэе, нóвэ, солóдкэ, хорóшэ);* формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вôн, вонá, вонó, воны́; он, онá, онó, оны́;* формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычным варыянтам суфікса *-ці -ті (ходíті, робíті);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пэкт́е; сéкті)* і інш.; ужыванне слоў: *драбíна, страмíна* 'драбіны (прыстаўная лесвіца)', *кóворот* 'вага ў калодзежным жураўлі', *красноголóвік, красноголóвэц* 'падасінавік', *орабýшок,*

*варабэ́й* ‘верабей’, *сковпэ́ц* ‘капец бульбы’, *соко́чут, сокора́т* ‘куры сакочуць’, *со́нейко, со́ненько* ‘сонейка’, *товкані́ца* ‘таўчоная бульба (пюрэ)’ і інш. [1–21].

4. У межах Выганаўскага Палесся ўпершыню вылучана **целяханская дыялектная мікразона**, якая ўключае цэнтральнацеляханскую падгрупу і паўднёвацеляханскую групу гаворак. Ёй уласцівы наступныя адметнасці: рэфлекс ***о** > [*э̂(ê)*] ў новых закрытых складах пад націскам *(вэ̂з, вêз, стэ̂л, кэ̂нь, кêнь);* пераважна цвёрды [*т*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(хо́дз’іт, хо́дз’ат /хо́дз*$^{д}$*’іт, хо́дз*$^{д}$*’ат, хо́д’іт, хо́д’ат/);* пераважна губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(пра́wда, до́wгі, купі́w);* формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксамі *-ці, -ті (ходзі́ці, робі́ці; ході́ті, робі́ті)* і інш.; ужыванне слоў: *журахві́ны* ‘журавіны’, *ла́пно* ‘вапна’, *небо́га, нэбо́га* ‘пляменніца’, *пэрэ́хмарок* ‘воблака’, *сві́нне* ‘свінні’, *спова́ці, спова́ті* ‘спяваць’, *судасі́цца, судо́сіцца* ‘сустрэцца’, *цэ́ха* ‘палатняная коўдра’ і інш. [1–3, 7, 10, 12, 20, 21].

5. Значная своеасаблівасць і складанасць дыялектнага ландшафту Выганаўскага Палесся з’яўляецца вынікам працяглых міждыялектных кантактаў і ўзаемаўплываў, адасобленасці прыроднымі межамі асобных густа заселеных мікрарэгіёнаў, міграцыйных і мікраміграцыйных працэсаў.

Выганаўскае Палессе ў гэтых адносінах вылучаецца тым, што яно з’яўляецца ўскраінай пашырэння інавацыйных з’яў, якія пранікалі ў гэты рэгіён з двух цэнтраў (ачагоў). Першы цэнтр (ачаг) – паўночны, ці гродзенска-баранавіцкі, або панямонскі, другі цэнтр (ачаг) – паўднёвы, ці берасцейска-пінскі, або ўласна загародскі. Існуюць яшчэ інавацыі ўласна сярэднябрэсцкія, якія супрацьпастаўляюцца як гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) поўначы, так і берасцейска-пінскаму (уласна загародскаму) поўдню.

“Паўночны” ачаг інавацый размешчаны на поўнач ад Выганаўскага Палесся. Для яго характэрны: 1) пераважна ацвярдзенне мяккіх шыпячых і ***р’**; 2) пераважна ацвярдзенне мяккага ***ц’**; 3) змякчэнне перад ***і** гістарычных паўмяккіх ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** і губных; 4) пераход у [*ц’*], [*ц’’*] мяккага ***т’** ва ўсіх пазіцыях, паўмяккага ***т˙** у пазіцыі перад ***і**; пераход у [*дз’*], [*дз’’*] мяккага ***д’** ва ўсіх пазіцыях, паўмяккага ***д˙** у пазіцыі перад ***і**; 5) аканне.

“Паўднёвы” ачаг лакалізуецца на поўдзень ад даследаванага рэгіёна. Для яго ўласцівы: 1) ацвярдзенне этымалагічных паўмяккіх губных перад ***е**; 2) ацвярдзенне гістарычных паўмяккіх зычных ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** перад ***е**; 3) ацвярдзенне этымалагічных паўмяккіх зычных ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** і губных перад ***і**; 4) пераход ***ѣ** ў [*і*]; пераход ***о** ў [*і*], [*ы*] ў новых закрытых складах пад націскам.

Ачагі “сярэднябрэсцкіх” інавацый размешчаны ў сярэдняй паласе Берасцейшчыны. Для іх характэрны: 1) пераход галоснага ***о** ў новых закрытых складах пад націскам у [э̂] “закрытае” або [э], утварэнне форм тыпу *“хо́дзіт,*

*ходзят /ходз$^{д}$іт, ходз$^{д}$ят, ходіт, ходят/*" у цэнтральнацеляханскіх і паўднёвацеляханскіх гаворках; 2) пераход мяккіх і паўмяккіх ***д' /*д˙, *т'/ *т˙** пераважна ў палаталізаваныя [*дз'*], [*ц'*] у паўночнабрэсцкіх гаворках даследаванага арэала.

Інавацыйныя з'явы выцеснілі ранейшыя моўныя рысы (ці архаізмы). Аднак у гаворках рэгіёна некаторыя архаічныя з'явы захаваліся: галосны ***о** ў пераднаціскных складах – ва ўсіх гаворках, акрамя гродзенска-баранавіцкіх; галосны ***о** ў новых закрытых складах пад націскам – у большасці гродзенска-баранавіцкіх, значнай частцы паўночнабрэсцкіх і некаторых валішчанска-аброўскіх гаворках; галосны [*ê*] на месцы ***ѣ** – у значнай частцы гродзенска-баранавіцкіх, пераважнай большасці паўночнабрэсцкіх, паўднёвацеляханскіх і валішчанска-аброўскіх гаворак, дыфтонг [*i͡e*] ў акрэсленай пазіцыі – у гаворцы в. Раздзялавічы; паўмяккія зычныя ***д, *т, *з, *с, *н** перад ***е, *і**, паўмяккія губныя перад ***і** – у некаторых валішчанска-аброўскіх гаворках; мяккія ***д', *т'** – у сярэдне- і паўночназагародскіх, паўднёвацеляханскіх і пераважнай большасці валішчанска-аброўскіх гаворак; паўмяккія ***д˙, *т˙** перад ***е, *і** – у некаторых валішчанска-аброўскіх гаворках; пазіцыйна абмежаваны мяккі ***ц'** – у асобных сярэднезагародскіх, валішчанска-аброўскіх гаворках; мяккія шыпячыя – у некаторых паўночнабрэсцкіх гаворках; мяккі ***р'** – у асобных паўночнабрэсцкіх, сярэднезагародскіх гаворках [1–5, 7–13, 15–18, 20, 21].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Моўны матэрыял і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны:

1) пры вывучэнні гісторыі паходжання (генезісу), фарміравання і развіцця гаворак тых тэрыторый, дзе адбываліся ўзаемаўплывы дыялектных і этнаграфічных асаблівасцей;

2) пры даследаванні ўзаемадзеяння гаворак з літаратурнымі мовамі;

3) пры параўнальным даследаванні гаворак беларускай і іншых славянскіх моў;

4) пры складанні праграм па вывучэнні беларускіх гаворак, дыялектных слоўнікаў, рэгіянальных дыялекталагічных атласаў;

5) пры напісанні вучэбных дапаможнікаў па беларускай дыялекталогіі, гісторыі беларускай літаратурнай мовы, гістарычнай граматыцы, лінгвакраязнаўстве, лінгвакультуралогіі, беларускай мове.

Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі, матэрыялы лінгвістычнага атласа "Гаворкі Выганаўскага Палесся" і "Атласа гаворак Выганаўскага Палесся" рэкамендуюцца для выкарыстання ў практыцы выкладання моваэнаўчых дысцыплін (дыялекталогіі, гісторыі беларускай літаратурнай мовы, гістарычнай граматыкі беларускай мовы, лінгвакраязнаўства, лінгвакультуралогіі, беларускай мовы і інш.) у ВНУ Рэспублікі Беларусь.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДАСЛЕДАВАННЯ


## Манаграфія

1. Самуйлік, Я. Р. Атлас гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік ; Брэсц. дзярж. тэхн. ун-т. – Брэст : БрДТУ, 2013. – 322 с.

## Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых выданнях

2. Самуйлік, Я. Р. Некаторыя асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Беларуская лінгвістыка : [зб. арт.] / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэдкал.: А. І. Жураўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1987. – Вып. 32. – С. 49–55.

3. Самуйлик, Я. Г. Гаворкі Выганаўскага Палесся ў міждыялектным асяроддзі / Я. Г. Самуйлик // Вісн. Житом. пед. ун-ту. – 2004. – Вип. 14. – С. 152–154.

4. Самуйлік, Я. Р. Панямонска-цэнтральнацеляханскі пучок ізаглос (па матэрыялах «Атласа народных гаворак Выганаўскага Палесся») / Я. Р. Самуйлік // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філал. навук. Літаратуразнаўства. Мовазнаўства. – 2008. – № 1. – С. 95–102.

5. Самуйлік, Я. Р. Гродзенска-баранавіцкія пучкі ізаглос у «Атласе народных гаворак Выганаўскага Палесся» / Я. Р. Самуйлік // Беларуская лінгвістыка : [зб. арт.] / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: А. А. Лукашанец (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – Вып. 61. – С. 53–60.

## Артыкулы ў часопісах і зборніках навуковых прац

6. Самуйлік, Я. Р. З гісторыі вывучэння гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Жывое народнае слова : дыялектал. зб. / Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; [рэд.: П. А. Міхайлаў, І. Я. Яшкін]. – Мінск, 1992. – С. 219–228.

7. Самуйлік, Я. Міждыялектныя сувязі гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Самуйлік // Діалектологічні студії : [зб. ст.] / НАН України, Ін-т українознавства ; відп. ред.: П. Гриценко, Н. Хобзей. – Львів, 2006. – Вип. 6 : Лінгвістичний атлас – від створення до интерпретації. – С. 115–125.

8. Самуйлік, Я. Панямонскія (гродзенска-баранавіцкія) пучкі ізаглос у «Атласе народных гаворак Выганаўскага Палесся» / Я. Самуйлік // Поліські зворини : зб. пам'яті проф. М. В. Никончука, 1937–2001 / Житом. дзярж. ун-т ; відп. ред. В. М. Мойсієнко. – Житомир, 2007. – С. 152–176.

9. Самуйлік, Я. Загародска-цэнтральнацеляханскі пучок ізаглос у лінгвістычным атласе «Гаворкі Выганаўскага Палесся» / Я. Самуйлік // Волинь філологічна: Текст і контекст. Західнополіські говірки в просторі та часі : зб. наук. пр. / Волин. нац. ун-т ; упоряд. Г. Л. Аркушина. – Луцьк, 2010. – Вип. 9. – С. 216–230.

10. Самуйлік, Я. Р. Цэнтральнацеляханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак (на матэрыялах лінгвістычнага атласа «Гаворкі Выганаўскага Палесся») / Я. Р. Самуйлік // Вестн. Брест. гос. техн. ун-та. Сер. Гуманитар. науки. – 2012. – № 6. – С. 112–116.

11. Клімчук, Ф. Канфігурацыя арэалаў інавацыйных з'яў Выганаўскага Палесся і праблема іх адноснай хcraналогіі / Ф. Клімчук, Я. Самуйлік // Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Л. В. Леванцэвіч, І. У. Сацута, Н. Р. Якубук ; пад агул. рэд. М. М. Аляхновіча. – Брэст, 2013. – С. 93–98.

12. Самуйлік, Я. Гаворкі Выганаўскага Палесся / Я. Самуйлік // České vědomí Bělarusi : [sbornik] / Univ. Karlova v Praze ; ed.: V. Lendělová [et al.]. – Praha, 2013. – S. 123–142.

### Матэрыялы і тэзісы дакладаў навуковых канферэнцый

13. Самуйлік, Я. Р. Асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Науково-технічна революція і сучасні процеси розвитку лексики української народно-розмовної мови : тез. доп. респ. конф., Ужгород, листоп. 1989 р. / Ужгор. держ. ун-т ; редкол.: Б. К. Галас [та ін.]. – Ужгород, 1989. – С. 128.

14. Самуйлік, Я. Р. Некаторыя асаблівасці лексічнай намінацыі гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках : материалы VI междунар. науч. конф., Гродно, 28–29 мая 1998 г. : в 2 ч. / Гродн. гос. ун-т ; отв. ред. С. А. Емельянова. – Гродно, 1998. – Ч. 1. – С. 204–206.

15. Самуйлік, Я. Р. Целяханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак / Я. Р. Самуйлік // Жыццём слугуючы Айчыне : матэрыялы навук. канф. да 80-х угодкаў праф. Ф. Янкоўскага, Брэст, 19 лістап. 1998 г. / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст, 1999. – С. 77–79.

16. Самуйлік, Я. Асаблівасці пазіцыйнага ўжывання *д, *т у гаворках Выганаўскага Палесся і наваколляў / Я. Самуйлік // Сучасні проблеми мовознавства та літературознавства : міжнар. конф. на честь 80-річчя проф. Й. Дзендзелівського : зб. наук. пр. / Ужгор. нац. ун-т ; редкол.: І. В. Сабадаш (відп. ред.) [та ін.]. – Ужгород, 2001. – Вип. 4 : Українське і слов'яньске мовознавство. – С. 470.

17. Самуйлік, Я. Р. Цэнтральнацеляханская група гаворак Выганаўскага Палесся (этналінгвістычна-гістарычная інтэрпрэтацыя) / Я. Р. Самуйлік // Берасцейска-Пінскае Палессе: мова, літаратура, гісторыя : матэрыялы рэсп. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка, Брэст, 24–25 кастр. 2002 г. / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст, 2002. – С. 97–100.

18. Самуйлік, Я. Р. Гаворкі Выганаўскага Палесся ў сістэме беларускай мовы / Я. Р. Самуйлік // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы респ. науч.-метод. конф., Брест, 12–13 нояб. 2003 г. / Брест. гос. ун-т ; редкол.: С. А. Королевич [и др.]. – Брест, 2004. – С. 80–82.

19. Самуйлік, Я. Структура лексічных карт «Атласа народных гаворак Выганаўскага Палесся» / Я. Самуйлік // Мовы ў Вялікім княстве Літоўскім і краінах сучаснай Цэнтральнай і Усходняй Еўропы: традыцыі і пераемнасць : матэрыялы IV міжнар. навук. канф., Брэст, 18–19 мая 2004 г. / Брэсц. дзярж. ун-т, Беларус. дзярж. ун-т, Будапешц. ун-т ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст, 2005. – С. 212–214.

20. Самуйлік, Я. Р. Лінгвагеаграфія гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Имя и слово: проблемы семантико-прагматического взаимодействия в славянских языках : материалы междунар. науч. конф., Брест, 19–20 апр. 2007 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т, Akad. Podlaska w Siedlcach ; редкол.: В. И. Сенкевич [и др.]. – Брест, 2007. – Ч. 2. – С. 299–302.

**Лінгвістычны атлас**

21. Самуйлік, Я. Р. Гаворкі Выганаўскага Палесся : лінгвіст. атлас для студэнтаў філал. фак. ун-та / Я. Р. Самуйлік ; Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст : БрДУ, 2009. – 199 с.

# РЭЗЮМЭ

**Самуйлік Ярослаў Рыгоравіч**

## Лінгвагеаграфія гаворак Выганаўскага Палесся

**Ключавыя словы:** Выганаўскае Палессе, фанетыка, марфалогія, лексіка, пучкі ізаглос, гродзенска-баранавіцкія, паўночнабрэсцкія (цэнтральнацеляханская падгрупа), паўднёвацеляханскія, валішчанска-аброўскія, сярэднезагародскія гаворкі, гаворка мястэчка Целяханы, целяханская дыялектная мікразона.

**Мэта даследавання:** на аснове палявых лінгвагеаграфічных і дыялекталагічных даследаванняў устанавіць структуру дыялектнага ландшафту Выганаўскага Палесся як састаўной часткі беларускіх народных гаворак.

**Метады даследавання:** лінгвагеаграфічны, апісальны, супастаўляльны, параўнальна-гістарычны.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** На аснове сабранага фактычнага матэрыялу ўпершыню ў беларускай лінгвістыцы праведзена комплекснае лінгвагеаграфічнае і дыялекталагічнае даследаванне дыялектнай мовы Выганаўскага Палесся, якое знаходзіцца ў зоне міждыялектных кантактаў і ўзаемаўплываў гаворак Берасцейска-Пінскага Палесся і Панямоння.

Па выніках праведзенага даследавання на тэрыторыі Выганаўскага Палесся выдзелены наступныя дыялектныя тыпы: гаворкі паўночнабрэсцкія (пераважна іх цэнтральцеляханская падгрупа, унутры яе – усходне- і заходнецеляханская мікрападгрупы), гродзенска-баранавіцкія, паўднёвацеляханскія, валішчанска-аброўскія, сярэднезагародская гаворка в. Сакалоўка, гаворка мястэчка Целяханы, а таксама целяханская дыялектная мікразона (уключае цэнтральнацеляханскую падгрупу паўночнабрэсцкіх і паўднёвацеляханскую групу гаворак).

Складзены і выдадзены лінгвістычныя атласы: ‘Гаворкі Выганаўскага Палесся” і “Атлас гаворак Выганаўскага Палесся”.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Матэрыялы дысертацыі будуць карысныя ў практыцы выкладання мовазнаўчых дысцыплін у ВНУ Рэспублікі Беларусь. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны філолагамі, гісторыкамі, археолагамі, этнографамі.

**Галіна прымянення.** Матэрыялы дысертацыі могуць знайсці прымяненне пры складанні праграм па вывучэнні беларускіх гаворак, дыялектных слоўнікаў, рэгіянальных дыялекталагічных атласаў; пры напісанні вучэбных дапаможнікаў па дыялекталогіі, гісторыі беларускай літаратурнай мовы, гістарычнай граматыцы беларускай мовы, лінгвакраязнаўстве, лінгвакультуралогіі, беларускай мове.

# РЕЗЮМЕ

**Самуйлик Ярослав Григорьевич**

**Лингвогеография говоров Выгоновского Полесья**

**Ключевые слова:** Выгоновское Полесье, фонетика, морфология, лексика, пучки изоглосс, гродненско-барановичские, севернобрестские (центральнотелеханская подгруппа), южнотелеханские, валищанско-обровские, среднезагородские говоры, говор местечка Телеханы, телеханская диалектная микрозона.

**Цель исследования:** на основании полевых лингвогеографических и диалектологических исследований установить структуру диалектного ландшафта Выгоновского Полесья как составной части белорусских народных говоров.

**Методы исследования:** лингвогеографический, описательный, сопоставительный, сравнительно-исторический.

**Полученные результаты и их новизна.** На основе собранного фактического материала впервые в белорусской лингвистике проведено комплексное лингвогеографическое и диалектологическое исследование диалектного языка Выгоновского Полесья, которое находится в зоне междиалектных контактов и взаимовлияний говоров Берестейско-Пинского Полесья и Понемонья.

По результатам проведённого исследования на территории Выгоновского Полесья выделены следующие диалектные типы: говоры севернобрестские (преимущественно их центральнотелеханская подгруппа, внутри её – восточно- и западнотелеханская микроподгруппы), гродненско-барановичские, южнотелеханские, валищанско-обровские, среднезагородский говор д. Соколовка, говор местечка Телеханы, а также телеханская диалектная микрозона (включает центральнотелеханскую подгруппу севернобрестских и южнотелеханскую группу говоров).

Составлены и изданы лингвистические атласы: «Говоры Выгоновского Полесья» и «Атлас говоров Выгоновского Полесья».

**Рекомендации по использованию.** Материалы диссертации будут полезны в практике преподавания языковедческих дисциплин в вузах Республики Беларусь. Результаты исследования могут быть использованы филологами, историками, археологами, этнографами.

**Область применения.** Материалы диссертации могут найти применение при составлении программ по изучению белорусских народных говоров, диалектных словарей, региональных диалектологических атласов; при написании учебных пособий по диалектологии, истории белорусского литературного языка, исторической грамматике белорусского языка, лингвокраеведению, лингвокультурологии, белорусского языку.

## SUMMARY

### Jaraslau Samujlik

### Language geography of the Vyhanaŭskaje Paliessie dialects

**Keywords:** Vyhanaŭskaje Paliessie, phonology, morphology, vocabulary, bundles of isoglosses, Hrodna-Baranavičy, North-Brest (Central-Cieliachany subgroup), South-Cieliachany, Vališča-Abrova, Middle-Zaharoddzie dialects, town of Cieliachany patois, Cieliachany dialectal zone.

**Objective of research:** determine the Vyhanaŭskaje Paliessie dialect landscape structure as an integral part of Belarusian dialects on the basis of field lingual-geographic and dialectal studies.

**Methods of research:** linguo-geographical, descriptive, contrastive, comparative-historical.

**The results obtained and their novelty.** For the first time in Belarusian linguistics on the basis of the factual material collected by the author a comprehensive lingual-geographic and dialectal study of the dialectal language of the Vyhanaŭskaje Paliessie, which is the zone of interdialectal contacts and mutual influences of the Brest-Pinsk Palessie dialects and those of the Paniamonnie, is conducted.

According to the results of the research, on the territory of the Vyhanaŭskaje Paliessie the following dialect types were determined: North-Brest (mainly their Central-Cieliachany subgroup and the East and West-Cieliachany microgroups within it), Hrodna-Baranavičy, South-Cieliachany, Vališča-Abrova dialects, the village of Sokalaŭka Middle-Zaharoddzie dialect, the town of Cieliachany patois and the Cieliachany dialectal microzone (includes Central-Cieliachany subgroup of North-Brest and South-Cieliachany group of dialects).

The linguistic atlases "The Dialects of the Vyhanaŭskaje Paliessie" and "The Atlas of the Vyhanaŭskaje Paliessie Dialects" are compiled and issued.

**Recommendations for use.** The materials of the thesis will be useful in teaching linguistic disciplines at universities of the Republic of Belarus. The results of the research can be used by philologists, historians, archaeologists, ethnographers.

**Field of application.** Materials of the thesis may have an application in compilation of programs for the Belarusian dialects study, dialect dictionaries, regional dialectological atlases, text-books on dialectology, the Belarusian literary language history, historical grammar of the Belarusian language, local language studies, linguistic culturology, the Belarusian language.

Падпісана да друку 18.06.2015. Фармат 60×84 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,75.
Тыраж 80 экз. Заказ 464, 465.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.